# *§ 31–0. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у 1920–1930-я гг.

ССРБ
НОВАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА
ХАРЧПАДАТАК
ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ
КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ
БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ
КАРАНІЗАЦЫЯ

**1. Новая эканамічная палітыка і савецкая мадэрнізацыя ў БССР.** Аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі Беларусі, тэрыторыя якой у 1914–1920 гг. знаходзілася ў эпіцэнтры Першай сусветнай вайны і польскай інтэрвенцыі, ускладнялася не толькі велізарнымі разбурэннямі, але і ростам бандытызму. Ваеннае становішча ў ССРБ было адменена толькі ў лютым 1922 г.

Ад 1921 г. у ССРБ праводзілася новая эканамічная палітыка. У першай палове 1920-х гг. адбывалася фарміраванне палітычнага саюзу савецкіх рэспублік, ішлі дыскусіі наконт кірункаў і формаў пераўтварэння грамадства. У гэтых умовах кіраўніцтва Савецкай Беларусі спрабавала рэалізаваць сваё бачанне мадэрнізацыі, якое абапіралася б на традыцыі, што складаліся, і асаблівасці эканамічнага развіцця. Фарміравалася беларускае зямельнае заканадаўства. Акцэнт быў зроблены на максімальным выкарыстанні ўласных рэсурсаў, кааперацыі і перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі. У сацыяльна-культурнай сферы важным фактарам зрабілася беларусізацыя.

## НОВАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА

**Мерапрыемствы ў горадзе**

- частковая прыватызацыя сярэдніх і дробных прадпрыемстваў;
- перавод прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік;
- дапушчэнне замежнага капіталу;
- адмена «ўраўнілаўкі» ў аплаце працы;
- барацьба з беспрацоўем;
- грашовая рэформа;
- суіснаванне трох відаў гандлю: прыватнага, кааператыўнага і дзяржаўнага

**Мерапрыемствы на вёсцы**

- замена харчразвёрсткі на харчпадатак;
- свабодны выбар формаў землекарыстання (таварыства, водруб, хутар);
- дазвол на найманне рабочай сілы, арэнду зямлі;
- кааперацыя

1. Успомніце, якія былі мэты ўвядзення новай эканамічнай палітыкі. Выявіце сувязі паміж мерапрыемствамі НЭПу і яго мэтамі. На дасягненне якіх мэт было накіраванае кожнае мерапрыемства?
2. Як вы лічыце, чаму ў гады НЭПу Савецкая дзяржава дазволіла прыватызаваць толькі дробныя і часткова сярэднія прадпрыемствы?

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Д. Ф. Прышчэпаў*

Народны камісар земляробства БССР у 1924–1929 гг. Д. Ф. Прышчэпаў прытрымліваўся прынцыпу свабоды выбару сялянамі формаў землекарыстання. Ён лічыў, што «...сацыялістычныя элементы, асабліва ў сельскай гаспадарцы, нельга стварыць адразу, у адзін-два гады... Асноўная форма, якая будзе аб'ядноўваць дробныя сялянскія гаспадаркі... гэта вытворчая кааперацыя». Ён адзначаў, што «няма дрэннай зямлі, ёсць дрэнныя гаспадары. І тое, колькі збожжа здыме мужык са свайго поля, колькі і якога малака дасць ягоная карова, перадусім залежыць ад яго самога, нарэшце, ад яго стаўлення да працы. У цяперашніх умовах сялянская гаспадарка носіць таварны характар, і чым больш яна будзе прадаваць прадуктаў сваёй вытворчасці на рынак, тым яна [будзе] мацнейшая і даходнейшая».

1. *Ад якіх фактараў, на думку Д. Ф. Прышчэпава, залежала паспяховасць сялянскай гаспадаркі?*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, што такое «вытворчая кааперацыя». У чым палягала выгада вытворчай кааперацыі для сялян?*

У 1926 г. валавая прадукцыя БССР значна перавысіла сярэднегадавыя паказчыкі даваеннага часу. Да 1927 г. быў адноўлены і даваенны аб'ём прамысловасці. Але ў індустрыяльным плане рэспубліка заставалася слаба развітой. Удзельная вага БССР у прамысловасці СССР складала менш за 1 %. Адчуваўся востры недахоп будаўнічых матэрыялаў і абсталявання, а таксама інжынерна-тэхнічных кадраў.

**Кірунані мадэрнізацыі**

Ад канца 1920-х гг. савецкая мадэрнізацыя рэалізоўвалася ў рамках агульных для ўсяго Саюза кірункаў: *індустрыялізацыі* (рост гарадской прамысловасці), *калектывізацыі* (адзіная форма — сельскагаспадарчая арцель) і *культурнай рэвалюцыі* (фарміраванне грамадзяніна адзінай сацыялістычнай дзяржавы).

У Савецкай Беларусі развіваліся пераважна лёгкая, перапрацоўчая і будаўнічая галіны прамысловасці. Разам з тым беларусы зрабілі пасільны ўнёсак у індустрыялізацыю СССР.

## АСАБЛІВАСЦІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ Ў БССР

- Прыгранічнае размяшчэнне БССР рабіла немэтазгодным будаўніцтва прадпрыемстваў цяжкай прамысловасці
- Развіваліся пераважна перапрацоўчая, лёгкая і будаўнічая галіны прамысловасці
- Шырока выкарыстоўваліся запасы лесу і торфу
- Развіваліся галіны па перапрацоўцы мінеральнай сыравіны (паліўная і хімічная прамысловасць)

Успомніце, якая галіна прамысловасці ў першую чаргу развівалася ў СССР у ходзе індустрыялізацыі. Чаму?




Выкарыстоўваючы дыяграму, ахарактарызуйце вынікі правядзення калектывізацыі ў БССР. Як вы лічыце, якія фактары абумовілі такі вынік?

Успомніце, за кошт якіх крыніц праводзілася індустрыялізацыя ў краінах Заходняй Еўропы.

Для правядзення індустрыялізацыі неабходныя былі рэсурсы (фінансавыя, матэрыяльныя, працоўныя). Здабыць іх трэба было ўнутры краіны. Асноўнай крыніцай індустрыялізацыі зрабіліся даходы ад розных галін эканомікі — прамысловасці, гандлю, сельскай гаспадаркі.

**Калектывізацыя**

Ад *1929 г.* у БССР праводзілася суцэльная калектывізацыя, якая суправаджалася раскулачваннем часткі сялян.

З мэтай забеспячэння калгасаў тэхнікай ствараліся машынна-трактарныя станцыі (МТС). Аднак прымяненне тэхнікі стрымлівалася забалочанасцю значнай часткі тэрыторыі БССР.

**Нацыянальная палітыка РКП(б)**

**2. Рэалізацыя нацыянальнай палітыкі.** Праграма бальшавікоў па нацыянальным пытанні дэкларавала правы ўсіх нацый на самавызначэнне, аж да ўтварэння самастойных дзяржаў. Нацыянальнае пытанне, у тым ліку і беларускае, абмяркоўвалася на X з'ездзе РКП(б) у 1921 г. У дакладзе І. В. Сталіна па дадзеным пытанні было адзначана: думка наконт таго, што камуністы насаджаюць беларускую

нацыянальнасць штучна, несправядлівая. «...Існуе беларуская нацыя, якая мае сваю мову, адрозную ад рускай, а таму ўзняць культуру беларускага народа можна толькі на роднай яго мове».

XII з’езд РКП(б) у 1923 г. вызначыў канкрэтныя задачы ў галіне нацыянальнай палітыкі.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З Рэзалюцыі XII з’езда РКП(б) па нацыянальным пытанні.**
**25 красавіка 1923 г.**

З’езд рэкамендуе членам партыі ў якасці практычных захадаў дабіцца таго, каб:

а) пры пабудове цэнтральных органаў Саюза была забяспечана роўнасць правоў і абавязкаў асобных рэспублік як ва ўзаемных паміж імі адносінах, так і ў дачыненні да цэнтральнай улады Саюза;

б) у сістэме вышэйшых органаў Саюза быў заснаваны спецыяльны орган прадстаўніцтва ўсіх без выключэння нацыянальных рэспублік і нацыянальных абласцей на пачатках роўнасці, з магчымым улікам прадстаўніцтва ўсіх нацыянальнасцей, што ўваходзяць у склад гэтых рэспублік;

в) выканаўчыя органы Саюза былі сканструяваны на пачатках, якія забяспечаць рэальны ўдзел у іх прадстаўнікоў рэспублік і задавальненне патрэб і запатрабаванняў народаў Саюза;

г) былі дадзены рэспублікам досыць шырокія фінансавыя і, у прыватнасці, бюджэтныя правы, якія забяспечаць магчымасць праяўлення іх уласнай дзяржаўна-адміністрацыйнай, культурнай і гаспадарчай ініцыятывы;

д) органы нацыянальных рэспублік і абласцей будаваліся пераважна з людзей мясцовых, якія ведаюць мову, побыт, норавы і звычаі адпаведных народаў;

е) былі выдадзеныя спецыяльныя законы, якія б забяспечылі ўжыванне роднай мовы ва ўсіх дзяржаўных органах і ва ўсіх установах, якія абслугоўваюць мясцовае іншанацыянальнае насельніцтва і нацыянальныя меншасці, — законы, якія маюць праследаваць і караць з усёй рэвалюцыйнай суровасцю ўсіх парушальнікаў нацыянальных правоў і асабліва правоў нацыянальных меншасцей;

ж) была ўзмоцнена выхаваўчая работа ў Чырвонай Арміі ў духу насаджэння ідэй братэрства і салідарнасці народаў Саюза і былі здзейснены практычныя захады па арганізацыі нацыянальных вайсковых часцей, з выкананнем усіх мер, неабходных для забеспячэння поўнай абараназдольнасці рэспублік.

1. *Вызначце асноўныя кірункі нацыянальнай палітыкі РКП(б).*
2. *Выкарыстоўваючы тэкст параграфа, канкрэтызуйце прыкладамі рэалізацыю нацыянальнай палітыкі РКП(б) у БССР.*

**3. Палітыка беларусізацыі.** Адной з праяў нацыянальнай палітыкі, што праводзілася ў БССР у 1920-я гг., зрабілася палітыка нацыянальна-культурнага і нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва — *беларусізацыя*.

**Перадумова беларусізацыі**

Перадумовамі для беларусізацыі сталі:

1) НЭП як палітыка супрацоўніцтва з сялянствам;

2) палітычная амністыя (1923 г., для тых палітычных дзеячаў, якія не выступалі са зброяй у руках супраць савецкай улады);

3) згуртаванне беларускіх нацыянальных сіл;

4) уз'яднанне ўсходняй часткі Беларусі (сакавік 1924 г., калі тэрыторыя БССР павялічылася ў 2 разы);

5) пачатак дзейнасці даследчых і вышэйшых навучальных устаноў.

**Этапы беларусізацыі**

Беларусізацыю як працэс можна падзяліць на 3 этапы:

1) складванне перадумоў (1921 — пачатак 1924 г.);

2) рэальнае ажыццяўленне (1924–1928 гг.);

3) згортванне (з 1929 г.).



*У. І. Пічэта*

Узбуйненне тэрыторыі БССР і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў сярэдзіне 1920-х гг. спрыялі пашырэнню нацыянальнага будаўніцтва. У 1924 г. была створана Цэнтральная камісія па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі. Ставілася задача перавесці дзяржаўны апарат, школы на беларускую мову. На 1928 г. 80 % агульнаадукацыйных школ перайшлі на беларускую мову навучання. З ініцыятывы рэктара БДУ У. І. Пічэты, які сам чытаў лекцыі на беларускай мове, пашыралася выкладанне беларускай мовы і гісторыі на ўсіх факультэтах універсітэта.

Беларусізацыя, якую разглядалі пачаткова як кампанію па пашырэнні сферы ўжывання беларускай мовы, неўзабаве ахапіла ўсе бакі жыцця дзяр-

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Паводле вынікаў перапісу 1926 г. у БССР жыло 80,6 % беларусаў, 8,2 % яўрэяў, 7,7 % рускіх і 2 % палякаў. Пры гэтым 67 % назвалі сваёй роднай мовай беларускую, 23,5 % — рускую, 7,5 % — ідыш і каля 1 % — польскую. У гарадах суадносіны былі іншыя: 40,2 % гараджан складалі яўрэі, пасля ішлі беларусы (39 %) і рускія (15,6 %). Для 19 % гараджан беларуская была роднай мовай.

1. *Вызначце фактары, якія спрыялі фарміраванню такога нацыянальнага і моўнага складу насельніцтва БССР.*
2. *Параўнайце пададзеныя звесткі з вынікамі перапісу насельніцтва Рэспублікі Беларусь 2019 г. Вылучыце агульнае і адметнае ў выніках гэтых перапісаў насельніцтва.*




**Каранізацыя**

жавы і грамадства. Гэты працэс у большай ступені насіў характар *каранізацыі* — развіцця мовы і культуры ўсіх нацыянальнасцей, якія жылі ў Савецкай Беларусі, а таксама прыцягнення ў органы кіравання жыхароў — ураджэнцаў Беларусі. Дзяржаўнымі былі 4 мовы: беларуская, руская, польская і ідыш.

У месцах кампактнага пражывання прадстаўнікоў той ці іншай нацыянальнасці ствараліся нацыянальныя сельскія саветы. На шматэтнічнай аснове фарміравалася і партыйна-гаспадарчае кіраўніцтва рэспублікі.

**Вынікі беларусізацыі**

Пад уздзеяннем працэсаў беларусізацыі адбывалася значнае развіццё краязнаўства, лінгвістыкі, гісторыі Беларусі. За некалькі гадоў было створана тое, што многія нацыі стваралі дзесяцігоддзямі: нацыянальная адукацыя, тэатр, кіно; сфарміравалася маладое пакаленне таленавітых беларускіх дзяржаўных дзеячаў, паэтаў і пісьменнікаў. У 1928 г. на аснове рэарганізацыі Інстытута культуры была створана Акадэмія навук.

Разам з тым па меры рэалізацыі палітыкі беларусізацыі было дапушчана шмат памылак (фармалізм, пагоня за колькаснымі паказчыкамі і г. д.). Фарміраванню многіх негатыўных тэндэнцый спрыяў і невысокі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці.

Напрыканцы 1920-х гг. адбылося змяненне нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі СССР. Развіццё адзінай савецкай дзяржавы патрабавала згуртаванасці савецкага грамадства, фарміравала патрэбу ў статусе рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін. Быў зроблены акцэнт на выхаванні новага савецкага чалавека.

**4. Вынікі сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.** У 1920–1930-я гг. сфарміравалася беларуская савецкая дзяржава, яе тэрыторыя і асноўныя інстытуты.

**Вынікі эканамічных пераўтварэнняў**

Дзякуючы актыўнаму росту прамысловасці ўжо ў 1931 г. аб'ём яе прадукцыі перасягнуў аб'ём валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі. З аграрнай рэспублікі БССР ператварылася ў аграрна-індустрыяльную.

Дасягненні БССР зрабіліся магчымымі дзякуючы высокаму працоўнаму энтузіязму, патрыятычнаму ўздыму ўдзельнікаў індустрыялізацыі, асабліва моладзі. Развіваўся стаханаўскі рух, прыняцце павышаных планаў з ініцыятывы рабочых.

Прыгранічнае становішча БССР, неразведанасць яе прыродных багаццяў, недахоп сыравіны, інжынерна-тэхнічных і рабочых кадраў не дазвалялі разгарнуць буйнамаштабнае будаўніцтва аб'ектаў цяжкай прамысловасці, як гэта рабілася ў іншых рэгіёнах СССР. Тым не менш частка капіталаўкладанняў накіроўвалася на развіццё энергетыкі, машынабудаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў.

## ПРАДПРЫЕМСТВЫ, ПАБУДАВАНЫЯ Ў БССР У ГАДЫ ПЕРШЫХ ПЯЦІГОДАК

**Першая пяцігодка (1928–1932 гг.)**

- швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» ў Віцебску;
- панчошна-трыкатажная фабрыка «КІМ» у Віцебску;
- фабрыка штучнага валакна ў Магілёве;
- трубаліцейны завод у Магілёве;
- завод сельскагаспадарчых машын у Гомелі;
- станкабудаўнічы завод «Станкатрэст» у Мінску

**Другая пяцігодка (1933–1937 гг.)**

- Гомельскі шклозавод;
- Крычаўскі цэментны завод;
- Аршанскі льнокамбінат;
- Быхаўскі ацэтонавы завод

**Трэцяя пяцігодка (1938–1941 гг.)**

- Мінскі радыёзавод;
- Мазырская электрастанцыя;
- Гомельскі рачны порт;
- Дняпроўска-Дзвінскае рачное параходства

1. Выкарыстоўваючы інфармацыю схемы, вызначце, якія галіны прамысловасці развіваліся ў БССР у той час.
2. Даведайцеся, якія з гэтых прадпрыемстваў працуюць у цяперашні час.
3. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія прамысловыя прадпрыемствы былі пабудаваны ў гады першых пяцігодак у вашым рэгіёне.

*Пераход да новай эканамічнай палітыкі быў спробай выкарыстаць прыватны капітал і рыначную сістэму ў інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва. За перыяд НЭПу былі адноўленыя прамысловасць і сельская гаспадарка БССР. Адначасова рэалізоўвалася палітыка нацыянальна-культурнага будаўніцтва — беларусізацыя. Развіццё працэсаў індустрыялізацыі спрыяла ператварэнню БССР у аграрна-індустрыяльную дзяржаву.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
|---|---|
| 1929–1933 гг. — сусветны эканамічны крызіс | 1928–1932 гг. — першая пяцігодка |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. У чым заключалася роля новай эканамічнай палітыкі ў аднаўленні гаспадаркі БССР? Якія яе захады вы лічыце найбольш дзейснымі? Як вы лічыце, чаму НЭП з'яўляўся толькі часовай мерай у палітыцы бальшавікоў?
2. Ахарактарызуйце асноўныя кірункі эканамічнай мадэрнізацыі БССР у 1930-я гг. Назавіце асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР. Чым яны былі абумоўлены?
3. Назавіце асноўныя мерапрыемствы палітыкі беларусізацыі. Вызначце вынікі рэалізацыі гэтай палітыкі.
4. Ахарактарызуйце вынікі эканамічных пераўтварэнняў у БССР напрыканцы 1930-х гг. Што азначала ператварэнне рэспублікі з аграрнай у аграрна-індустрыяльную? Якое значэнне гэта мела для рэспублікі?